# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ПЯТНІЦА
4 лістапада
1994 года
№ 10 (1715)


● НАСТАВІЎШЫ ВУШЫ

## У клопаце пра нас

*На пытанне карэспандэнта «Беларускага універсітэта» адказвае рэктар БДУ Фёдар Мікалаевіч КАПУЦКІ.*

**— Фёдар Мікалаевіч, што робіць рэктарат, каб неяк зняць напружанне і падтрымаць маральна і матэрыяльна супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта? Цэны растуць хутчэй за зарплату...**

— Мы, канешне, з вялікім натхненнем сустрэлі Указ Прэзідэнта аб павелічэнні заработнай платы супрацоўнікам БДУ у два разы і аб павелічэнні стыпендый студэнтам да 34,5 тыс. рублёў. Мы за гэта яму вельмі ўдзячны. Але, зразумела, зарплата ўсё роўна не дагоніць цэны. Рэктарат універсітэта робіць захады, каб знайсці дадатковыя сродкі і падтрымаць супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў універсітэта. Да прыкладу, у кастрычніку падчас выплаты аванса ўсім супрацоўнікам універсітэта выдадзена па аднаму службоваму акладу, аспірантам па 35 тыс. рублёў, студэнтам па 10 тыс. рублёў. Таксама за кастрычнік будзе выплачана па аднаму службоваму акладу супрацоўнікам навукова-даследчай часткі універсітэта. Усе гэтыя сродкі — за кошт эканоміі фонда заработнай платы і гаспадарча-камерцыйнай дзейнасці: платная адукацыя, аплата за другую вышэйшую адукацыю, падрыхтоўка замежных спецыялістаў, арэнда памяшканняў.

Рэктарат шукае магчымасці, каб выплаціць надбаўкі (50 %) да зарплаты прафесарска-выкладчыцкаму саставу, супрацоўнікам, аспірантам універсітэта ў лістападзе і снежні.

## ЛАНСС ПРЫХОДЗІЦЬ НА ДАПАМОГУ

Недарэмна кажуць, што пачатак — палова справы. Ва ўсякім разе, першая музычная акцыя Прадзюсерскага цэнтра авангарднага мастацтва «ЛАНСС Эксклюзив арт» зможа пацвердзіць гэта. Бо добрае пачынанне — залог будучых поспехаў.

Гэты цэнтр мае зусім не камерцыйную арганізацыю. Яго задача — аб'яднаць і дапамагчы маладым музычным гуртам, а таксама пачынаючым мастакам, тэатрам, танцавальным гуртам і асобным танцорам — словам, усім тым, хто малады, таленавіты і мае патрэбу ў дапамозе. Плануецца рэгулярнае правядзенне розных акцый (а ў будучым — нават тэлеперадача, якая будзе асвятляць дзейнасць цэнтра), у якіх маладыя таленты змогуць не толькі заявіць пра сябе, а па магчымасці і атрымаць прызнанне і рэкламу. Для гэтай мэты цэнтр мае сваё памяшканне ў Парку Чалюскінцаў.

І вось першая прыступка — музычная акцыя, у якой прынялі ўдзел гурты «Белорусский климат», «Bartly's Dreams», «Beauty by mistake», «Why not».

На сённяшні дзень ЛАНСС — гэта адзіная арганізацыя па ўсёй Беларусі, якая носіць глыбока ідэйны характар: дапамагчы ўсім тым, хто не зможа дапамагчы сабе сам. Дарэчы, ЛАНСС расшыфроўваецца даволі проста: гэта Лена, Андрэй, Сяргей, Саша — людзі, якія стварылі гэты цэнтр і якія лічаць, што першая акцыя пацвярджае, што задуманае ўдалося давесці да канца. «Мы пачалі, будзем працягваць і ніякія няўдачы нас не зломяць».

Шаноўныя студэнты! І сярод вас, безумоўна, ёсць тыя, хто хоча вынесці сваю творчасць на суд грамадства, аднак пакуль не меў магчымасці на гэта, або проста хоча быць пачуты. Для вас — кантактны тэлефон 64-32-22. У лістападзе-снежні плануецца правядзенне тэатральнай і мастацкай акцый, складаецца банк данных.

АЛЕСЯ Т.

## ЗАПРАШАЕМ У БІБЛІЯТЭКУ

У кастрычніку ў бібліятэцы Белдзяржуніверсітэта адбылася прэзентацыя кніг выдавецтваў Германіі, якія адпавядаюць шматлікім запытам чытачоў: падручнікі па вывучэнню нямецкай мовы, літаратура па матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі (на англійскай мове), эканоміцы, філасофіі, паліталогіі, журналістыцы, гісторыі (на нямецкай мове).

Гэта падзея мае вялікае значэнне для нашага універсітэта. Доўгі час амаль не выдзялялася валюты на закупку замежнай літаратуры, што пагражала інфармацыйна-навуковай ізаляцыяй, у якой у хуткім часе маглі апынуцца (і амаль апынуліся) выкладчыкі і студэнты вну рэспублікі. І вось, год таму ад Міністэрства адукацыі і навукі Федэратыўнай Рэспублікі Германіі бібліятэка атрымала 200 тыс. марак, на якія вырашана было набыць друкаваныя выданні Германіі. Трыста выдавецтваў ФРГ далі згоду на азнаямленне з тэматычнымі планамі выдання літаратуры. Бібліятэка сумесна з кафедрамі Белдзяржуніверсітэта апрацавала ўсю інфармацыю, што дало падставу зрабіць заказ на 200 тыс. марак, які быў выкананы амаль цалкам.

І вось — прэзентацыя кніг з удзелам пасла ФРГ спадара Альбрэхта, рэктара Белдзяржуніверсітэта, гасцей з БПА, лінгвістычнага універсітэта і іншых вну краіны.

Акрамя кніг бібліятэка атрымала аўдыё- і відэа-касеты з вывучэннем моўнага курсу, а да кніг па інфарматыцы і вылічальнай тэхніцы прыкладзены дыскеты з праграмамі. Падручнікі па вывучэнню замежных моў разыйдуцца па моўных кафедрах, астатнія кнігі паступяць у аддзел замежнай літаратуры бібліятэкі Белдзяржуніверсітэта, дзе паступова плануецца набыць абсталяванне для паўнацэннага карыстання інфармацыяй.

Кацярына ТКАЧЭНКА

● ЮБІЛЕІ

## ГІСТФАКУ — 60!




**28 сакавіка 1919 г. на паседжанні Камісіі вышэйшых навучальных устаноў народнага камісарыята РСФСР па асвеце пад старшынствам М. Пакроўскага было прызнана «принципиально желательным» мець у складзе БДУ факультэт, які б рыхтаваў знаўцаў гісторыі і іншых грамадскіх навук.**

**11 ліпеня 1921 г. у Мінскім дзяржаўным тэатры, у гадавіну вызвалення горада ад польскай акупацыі, адбылося ўрачыстае адкрыццё БДУ. Першае слова трымаў наркам асветы гісторык У. Ігнатоўскі. Ад імя прафесуры выступілі гісторыкі У. Пічэта і Ф. Турук. Апошні свой даклад зрабіў на беларускай мове.**

**На паседжанні Вучонага Савета БДУ 9 верасня 1921 г. былі зацверджаны ў ліку іншых прафесараў і гісторыкі.**

**ФГН з 1921 г. узначаліў дэкан У. Ігнатоўскі (яго намеснікам быў С. Вальфсон). У першы год з больш чым тысячы заяў адабралі 739 (усяго ў БДУ — 1390 студэнтаў).**

**3-га студзеня 1922 г. была наладжана работа некалькіх кабінетаў: па рускай гісторыі, па ўсеагульнай гісторыі, па гісторыі мастацтваў, па гісторыі рэлігіі.**

**У 1922 г. да двух аддзяленняў ФГН (сацыяльна-гістарычнага і этнолага-лінгвістычнага) былі дабаўлены яшчэ два (фізіка-матэматычнае і натуральна-гістарычнае). Гэта стварыла падставы для арганізацыі новага факультэта — педагагічнага.**

**У 1924 г. пачалі арганізоўвацца краязнаўчыя гурткі і таварыствы на факультэтах.**

**У 1925—1926 вучэбным годзе ва універсітэце пры актыўным удзеле А. Смоліча было арганізавана студэнцкае навукова-даследчае краязнаўчае таварыства. Праз год абралі яго праўленне пад старшынствам У. Пічэты і распрацавалі статут. Да канца 1927 г. у складзе таварыства дзейнічала 5 секцый, дзве з якіх мелі гістарычную накіраванасць: культурна-гістарычная і сацыяльна-гістарычная.**

**Адкрыццё гістфака непасрэдна пасля майскай 1934 года пастановы СНК СССР, ЦК ВКП(б) аб выкладанні грамадзянскай гісторыі ў школах Савецкага Саюза ўспрымалася калектывам універсітэта як доказ таго, што «марксісцка-ленінская гістарычная навука мае вялікае значэнне для справы будаўніцтва сацыялізма». А ў БССР жа і на 1936 г. меліся толькі 63 гісторыкі — работнікі навуковых устаноў і ВНУ.**

**У першы год існавання гістфака на студэнцкія лаўкі села 67 чалавек. Потым кожны год прыём павялічваўся на 15—20 чалавек. Дэканам быў прызначаны акадэмік В. Шчарбакоў.**

* * *

**ГІСТАРЫЧНАМУ ФАКУЛЬТЭТУ БДУ — 60 ГАДОЎ.**

**Не, гэта не пенсійны ўзрост, хоць пройдзены шлях багаты на падзеі, дасягненні, але ж і на горыч і расчараванне. На пенсію выйшлі ўжо некалькі пакаленняў выпускнікоў, і кожны год дзесяткі маладых выкладчыкаў і навукоўцаў, архівістаў і грамадскіх дзеячаў пакідаюць сцены альма-матэр, уключаюцца ў вялікае, а на цяперашнія часы — і нялёгкае жыццё.**

**Подых гэтага жыцця гістфак адчувае штодня, адгукаецца на яго патрэбы. У апошнія гады тут кардынальна перагледжаны вучэбныя праграмы, змест лекцый і практычных заняткаў. Сярод розных галін гісторыі ў праграме навучання галоўнае месца займае гісторыя Беларусі сярэднявечча і гісторыя Беларусі новага і навейшага часу.**

**Увогуле, беларусазнаўства займае каля трэцяй часткі ў раскладзе заняткаў.**

**Побач з «чыстымі» гісторыкамі на факультэце рыхтуюцца кадры спецыялістаў для архіваў і музеяў. Маладой беларускай дзяржаве патрэбныя свае дыпламаты — гістфак узяў на сябе і гэтую адказную і няпростую задачу: ужо трэці год працуе аддзяленне міжнародных адносін.**

**Многія ВНУ краіны могуць пазайздросціць гістфаку БДУ, перш за ўсё — яго навукова-метадычнаму патэнцыялу. Тут працуюць 14 прафесараў. Многія пакаленні гісторыкаў удзячныя сваімі ведамі і сваімі поглядамі на жыццё старэйшаму выкладчыку факультэта прафесару Льву Міхайлавічу Шнеярсону. А самаму маладому прафесару — Анатолю Разанаву — усяго толькі 39 гадоў.**

**Штогод супрацоўнікі гістфака выдаюць манаграфіі, дзесяткі навуковых артыкулаў. Факультэт уносіць свой важны ўклад у навуковую распрацоўку мінулага Бацькаўшчыны. Але ж тут не абмяжоўваюцца толькі гісторыяй Беларусі. Менавіта гістфак БДУ з'яўляецца буйнейшым (калі не сказаць адзіным) у краіне цэнтрам вывучэння сусветнай гісторыі. Ёсць свая, вядомая ў свеце школа германістыкі. Фарміруецца вельмі салідны цэнтр славяназнаўства.**

**Гістфак упэўнена пракладвае свой шлях у нашым вірлівым жыцці.**

**Поспехаў яму!**

## НАВІНЫ З ХІМФАКА

Нядаўна кафедра арганічнай хіміі шырока адзначала дзень нараджэння выкладчыка Аляксандра Мікалаевіча Рабцава — чалавека чулага, але прынцыповага, за што яго так і любяць студэнты. Асабліва гарачыя віншаванні перадаюць яму студэнткі 3-га курса.

* * *

Крадзяжы ў лабараторыях — праблема вострая на факультэце. Нядаўна, напрыклад, знікла зусім новая электрычная пліта. Пад пагрозай распачынання крымінальнай справы невядомыя ўсё ж вярнулі такі неабходны прыбор.

* * *

Асаблівую радасць студэнтам хімфака прыносяць адрамантаваныя прыбіральні, якія сваім цяперашнім выглядам спрыяюць павышэнню паспяховасці студэнтаў. Пра тое, як выглядалі санвузлы летась, узгадваць ніхто не хоча. Большасць студэнтаў звязвае такія змены з узнікненнем рэкламы «Беларусбанка» на факультэце.

* * *

І апошняе — гэта холад. Гэтая праблема вядомая, напэўна, усім студэнтам універсітэта. Усе мы чхаем, кашляем і не адчуваем адмёрзлых ног пасля заняткаў. А на хімфаку ёсць месца, дзе ратуюцца ўсе,— гэта бар. Часам туды заходзіць пагрэцца і папіць кавы сам дэкан факультэта.

**Са слоў незалежных агентаў запісаў А. РАШЧУПКІН.**

## Фёдараў Фёдар Іванавіч



13 кастрычніка 1994 г. на 84-м годзе жыцця памёр буйнейшы фізік-тэарэтык, вядомы заснавальнік і арганізатар фізічнай навукі ў Беларусі, Герой Сацыялістычнай працы, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, Прэзідэнт Беларускага фізічнага таварыства, член Прэзідыума АНБ, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Фёдар Іванавіч Фёдараў.

Навуковая грамадскасць Беларусі, уся сусветная фізічная навука панеслі вялікую, незаменную страту. Перастала біцца сэрца знакамітага сына беларускага народа, аддаўшага больш за 60 гадоў свайго жыцця самаахвярнай і надзвычай плённай навукова-даследчай, педагагічнай і навукова-арганізацыйнай дзейнасці на карысць Бацькаўшчыны. Беларусь страціла буйнейшага вучонага, імя якога назаўсёды ўпісана ў гісторыю навукі XX стагоддзя.

Ф. І. Фёдараў нарадзіўся 19 чэрвеня 1911 г. у вёсцы Турэц Гродзенскай вобласці ў сям'і настаўніка (у будучым вядомага беларускага пісьменніка Янкі Маўра). Пасля заканчэння ў 1931 г. фізіка-матэматычнага аддзялення педагагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта і двух гадоў педагагічнай працы ў г. Крычаве Ф. І. Фёдараў быў накіраваны ў аспірантуру Ленінградскага універсітэта. У 1936 годзе Ф. І. Фёдараў паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю, якую ён выканаў пад навуковым кіраўніцтвам вядомага фізіка-тэарэтыка — акадэміка У. А. Фока. У тым жа годзе Ф. І. Фёдараў вяртаецца ў Мінск і пачынае працаваць на нядаўна створаным фізіка-матэматычным факультэце універсітэта. Уся далейшая творчая дзейнасць Ф. І. Фёдарава неразрыўна звязана з Белдзяржуніверсітэтам. У 1938 г. ім была арганізавана кафедра тэарэтычнай фізікі, загадчыкам якой Фёдар Іванавіч з'яўляўся на працягу 24 гадоў. У найбольш цяжкі для універсітэта час (1943—1950) Ф. І. Фёдараў быў дэканам фізіка-матэматычнага факультэта. Да апошніх дзён свайго жыцця прафесар кафедры тэарэтычнай фізікі Ф. І. Фёдараў аддаваў усе свае сілы, свой надзвычайны талент вучонага і яскравае педагагічнае дараванне падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў, разгортванню навукова-даследчай работы. Многія выпускнікі універсітэта складаюць вядомую беларускую школу тэарэтычнай фізікі — школу Фёдарава. Каля 40 дактароў і 100 кандыдатаў фізіка-матэматычных навук лічаць для сябе вялікім гонарам быць вучнямі Фёдара Іванавіча. У іх ліку — вядомыя цяпер вучоныя, акадэмікі і члены-карэспандэнты АНБ, лаўрэаты Дзяржаўных прэмій.

Унікальны творчы патэнцыял Ф. І. Фёдарава як вучонага і арганізатара навукі надзвычай ярка раскрыўся ў час яго работы ў Акадэміі навук Беларусі. Ім была створана лабараторыя тэарэтычнай фізікі ІФ АНБ, якой ён нязменна кіраваў да 1987 года. На працягу 25 гадоў, з часу заснавання (1963) і да 1987 г. Ф. І. Фёдараў узначальваў Аддзяленне фізікі і матэматыкі АН БССР (зараз Аддзяленне фізікі, матэматыкі і інфарматыкі АНБ).

За перыяд шматгадовай навуковай работы Ф. І. Фёдаравым атрыман шэраг буйнейшых вынікаў у крышталеоптыцы, акустыцы крышталяў, тэорыі элементарных часцінак і фундаментальных фізічных узаемадзеянняў, якія склалі фундамент далейшых навуковых даследаванняў. Іх аб'ядноўвае арыгінальны, створаны Фёдарам Іванавічам агульны каварыянтны падыход да вырашэння праблем і задач тэарэтычнай фізікі на падставе паслядоўна распрацаваных і выкарыстаных ім матэматычных (алгебраічных і тэарэтыка-групавых) метадаў. Усяго акадэмікам Ф. І. Фёдаравым апублікавана звыш 450 навуковых прац і 6 манаграфій, шырока вядомых міжнароднай навуковай грамадскасці.

Чулы і ўважлівы кіраўнік, бліскучы педагог і лектар, патрабавальны настаўнік і выхавацель, таленавіты вучоны і арганізатар навукі, Фёдар Іванавіч Фёдараў заваяваў заслужаную пашану і вельмі высокі аўтарытэт сярод шырокай навуковай грамадскасці рэспублікі і далёка за яе межамі. Выключныя дасягненні Ф. І. Фёдарава ў галіне фізічнай навукі, станаўленні і развіцця вышэйшай адукацыі і навуковых даследаванняў па фізіцы і матэматыцы ў нашай рэспубліцы адзначаны самымі вялікімі дзяржаўнымі ўзнагародамі.

Фёдар Іванавіч вызначаўся арганічным спалучэннем рэдкіх чалавечых якасцей: выключнай інтэлігентнасцю, нязменнай тактычнасцю ў адносінах з людзьмі і разам з тым надзвычайнай прынцыповасцю, высокай грамадскай мужнасцю.

Светлая памяць аб Фёдары Іванавічы Фёдараве, буйнейшым вучоным, таленавітым педагогу і выхавацелю навуковай моладзі, чалавеку вялікай душы і сціпласці, назаўсёды захаваецца ў сэрцы ўсіх, хто меў гонар і шчасце яго ведаць, жыць і працаваць побач з ім.

**КАФЕДРА ТЭАРЭТЫЧНАЙ ФІЗІКІ**

● НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

# Справаздача рэктара БДУ Фёдара Мікалаевіча Капуцкага

*(Працяг. Пачатак у нумары «БУ» за 20 кастрычніка г. г.).*

Без высокай увагі да праблемаў арганізацыі работы са студэнтамі як у вучэбны, так і пазавучэбны час мы сутыкаемся з ростам тэндэнцыяў нестабільнасці ў маладзёжным асяроддзі. А ўжо ад нас чакаюць замацавання сярод студэнцтва сістэмы сацыяльных каштоўнасцяў і маральных арыентацый, фарміравання пачуццяў грамадзянскасці і адказнасці.

Рэктарату, дэканатам факультэтаў трэба звярнуць асаблівую ўвагу на працу ў інтэрнатах, на арганізацыю свабоднага часу студэнтаў. На жаль, тут усё пушчана на самацёк... Расце прававы нігілізм, адчужэнне моладзі ад старэйшага пакалення, павялічваецца злачыннасць, вандалізм у інтэрнатах. Яшчэ раз заклікаю пераасэнсаваць свае адносіны да маладзёжных праблемаў. Для таго, каб патрабаваць, моладзі трэба нешта даць: сваю ўвагу, патрабавальнасць. У бліжэйшы час намі будзе прапанавана схема кіраўніцтва выхаваўчым працэсам, змена структуры кіравання ім.

Дзяржаўнымі структурамі па навуцы і тэхналогіях распрацавана канцэпцыя навукова-тэхнічнай палітыкі на 1994—1996 гады, адпаведна якой устанаўліваецца новы парадак фінансавання навукова-даследчых работ: у першую чаргу выдзяляюцца дзяржаўныя сродкі на конкурснай аснове па прыярытэтных для Рэспублікі напрамках з наступным заключэннем дагавору паміж дзяржаўным заказчыкам і выканаўцам, у якім прадугледжваецца матэрыяльная адказнасць выканаўцы за своечасовае выкананне навуковага праекта.

Пры ўсёй правільнасці пастаноўкі гэтага пытання мы ўсё-такі лічым, што фундаментальныя даследаванні высокага ўзроўню ў такой невялікай дзяржаве як Беларусь не ўдаецца ўпісаць у гэту схему фінансавання без незваротных страт.

І такія страты асабліва небяспечны для універсітэтаў, бо яны па сваёй асноўнай сутнасці — установы, дзе навучанне вядзецца на падставе дасягненняў фундаментальнай навукі.

Дарэчы, таму такія даследаванні і павінны быць сканцэнтраваны, у асноўным, ва універсітэтах. Канкрэтны прыклад. Калі задаць пытанне, ці ёсць патрэбы ў рэспубліцы займацца ядзернай фізікай, то з улікам цяперашніх магчымасцей вынікае адказ, што няма. Але адказ будзе прама супрацьлеглым, калі пытанне гэтае разглядаць гістарычна, канкрэтна з улікам патрэб адукацыі, а таксама іншых галін навукі. Калі будуць пытанні, я адкажу.

У цяперашняй крызіснай сітуацыі можна вельмі лёгка аднесці фундаментальныя даследаванні да непрыярытэтных, закрыць дарогу ў фонд дакументальных даследаванняў і тым самым пазбавіць магчымасці працягваць іх, беззваротна згубіць унікальнае абсталяванне і падрыхтаваныя кадры. Таму мы лічым, што універсітэт павінен мець магчымасць падтрымліваць фундаментальныя прыродазнаўчыя і сацыяльна-гуманітарныя навуковыя даследаванні за лік базавага фінансавання, якое ў далейшым можа выдзяляцца Міністэрствам, але спецыяльна атэставаным на правядзенне фундаментальных даследаванняў.

Сапраўды, на ўсе навуковыя напрамкі, якія распрацоўваліся ў Беларусі, сродкаў не хопіць, але навуковую эліту неабходна захаваць. Пераважнае фінансаванне вядучых устаноў прынята ва ўсім свеце.

Навуковыя падраздзяленні Белдзяржуніверсітэта перажываюць гэты цяжкі час з пэўнымі стратамі. Колькасць навуковых супрацоўнікаў зменшылася на 136 чалавек (у асноўным — НДІ ПФП, на 101 чалавек), кандыдатаў навук — на 71, дактароў — на 6. Праўда, у першым паўгоддзі 1994 года абаронена 8 доктарскіх і 36 кандыдацкіх дысертацый супрацоўнікамі універсітэта (у тым ліку — 3 дактарантамі і 25 выпускнікамі аспірантуры).

У найбольш цяжкі момант, калі колькасць чалавека-дзён па водпуску за свой кошт дасягнула 5 тысяч па НДЧ і 2 тысяч па НІЦ, прамым зваротам ва Урад удалося атрымаць 1 млрд. рублёў на навуковыя даследаванні, а таксама мэтавы крэдыт у такім жа памеры. Гэта некалькі аблегчыла становішча.

Трэба адзначыць, што на недахоп сродкаў для навукова-даследчых работ накладваецца хранічнае адставанне індэксацыі заработнай платы і затрымка з паступленнем грошай на разліковы рахунак універсітэта. Усё гэта моцна ліхарадзіць навуковыя падраздзяленні. Калі да гэтага дадаць вельмі нізкі ўзровень аплаты працы, то відавочна, што ў лічаныя месяцы кадравы патэнцыял навукі можа быць страчаны.

Расце колькасць супрацоўнікаў, запрашаемых на пэўны тэрмін (звычайна ад 1 месяца да года) на навуковую працу або стажыроўку ў краіны далёкага замежжа. Толькі за 8 месяцаў бягучага года такімі запрашэннямі карысталіся 36 супрацоўнікаў, 2 дактаранты і 3 аспіранты. Гэтыя паездкі даюць доступ да інфармацыі, магчымасць карыстацца сучасным абсталяваннем, устанавіць кантакты — гэта значыць, дапамагаюць правесці навуковыя даследаванні на сучасным узроўні, і галоўнае, што не менш важна, замежныя паездкі, гранты дапамагаюць захаваць кадры, бо неабходнай умовай іх атрымання з'яўляецца далейшая праца ва універсітэце.

Зразумела, некаторыя застаюцца за мяжой, аднак небяспека ўнутранай уцечкі мазгоў у бізнес і г. д. праз дрэннае матэрыяльнае становішча і ўмовы працы значна большая. Работа па атрыманаму гранту дае магчымасць займацца сваёй справай ва універсітэце.

Зразумела, што сумесныя намаганні рэктарата ў 1993—1994 гадах, падтрыманыя канкрэтнымі прапановамі і праектамі вучоных універсітэта, забяспечылі прыкметную фінансавую дапамогу ў фінансаванні навуковых даследаванняў ва універсітэце.

Няма сумнення, што фінансаванне міжнародных праектаў, сумесных даследаванняў у нашых і замежных лабараторыях з цягам часу можа стаць дамінуючай формай падтрымкі нацыянальнай навукі ў шматлікіх краінах, таму арыентацыя на гэтую форму падтрымкі — гэта правільнае разуменне перспектывы і ў нашым універсітэце.

Шэраг унутрыуніверсітэцкіх праблем, звязаных з НДР, патрабуе неадкладнага вырашэння ў сённяшняй складанай сітуацыі. Перш за ўсё гэта адносіцца да ўдзелу навуковых падраздзяленняў у вучэбным працэсе.

Нягледзячы на наяўнасць унікальнай эксперыментальнай базы НДІ ЯП, фізічны факультэт практычна не выкарыстоўвае яе ў вучэбных мэтах.

З трох НДІ універсітэта НДІ ФХП найбольш цесна звязаны з унутрыуніверсітэцкімі вучэбнымі і навуковымі структурамі. Дастаткова адзначыць, што хімічным факультэтам, НДІ ФХП і НІЦ сумесна праводзіцца важная для Рэспублікі работа па тэхналогіі здабычы каштоўных металаў з адыходаў, у многім дзякуючы якой і ўдалося атрымаць тыя дадатковыя грошы на НДР, аб якіх вялася размова.

Трэба выразна разумець, што ў пытаннях навукова-вытворчай, інавацыйнай дзейнасці забарончыя меры ні да чаго добрага не прывядуць. Прыкладная навука павінна сама сябе акупаць і, не ў апошнюю чаргу, праз гэтую дзейнасць. Таму універсітэт выступаў ініцыятарам стварэння тэхнапарка і па меры неабходнасці падтрымлівае яго, а таксама цвёрда адстойвае неабходнасць захавання былога СКТБ у структуры універсітэта ў якасці навукова-інжынернага цэнтра, а ў будучым — вучэбнага навукова-інжынернага цэнтра.

Крызісныя з'явы ў навуцы не абыходзяць і аспірантуру — адзіную форму планамернай і мэтанакіраванай падрыхтоўкі навуковых і педагагічных работнікаў, асноўную крыніцу амаладжэння кадравага патэнцыялу. Яны асабліва праяўляюцца пры размеркаванні аспірантаў. Фактычна размяркоўваецца толькі чвэрць тых, хто скончыў аспірантуру. Гэтая праблема не столькі унутрыуніверсітэцкая (хоць і тут ёсць пытанні), колькі агульнарэспубліканская.

У апошнія гады аспірантура адкрываецца пры ўсё большай колькасці навучальных і навуковых устаноў без адпаведнага аналізу мэтазгоднасці і неабходнасці гэтага крока, а таксама магчымасці весці падрыхтоўку аспірантаў.

Трэба адзначыць, што ў БДУ па выніках мінулага года доля паспяхова скончыўшых аспірантуру склала не больш 60 %, а ў той час у Акадэміі навук — прыблізна 25 %.

У цяперашні час назіраецца пашырэнне міжнародных кантактаў Белдзяржуніверсітэта на розных узроўнях. Для ўладкавання і сістэматызацыі гэтага тыпу дзейнасці распрацавана агульная канцэпцыя, шырокае абмеркаванне якой набліжаецца да завяршэння. Мэта шэрагу палажэнняў канцэпцыі — спалучыць інтарэсы універсітэта, яго падраздзяленняў з інтарэсамі супрацоўнікаў у сферы замежных сувязяў.

У мінулыя гады прыярытэтнымі накірункамі для універсітэта былі сумесныя работы ў межах заключаных двухбаковых дагавораў. Гэтая праца працягваецца і зараз. Усяго на сённяшні дзень заключана 24 пагадненні аб супрацоўніцтве на міжнародным узроўні.

Аднак па прычыне фінансавых праблем мы вымушаны перанесці сваю ўвагу і намаганні ў гэтай дзейнасці на ўдзел у міжнародных праектах і праграмах, што фінансуюцца рознымі фондамі і арганізацыямі. Гэта атрыманне грантаў, абсталявання, літаратуры і г. д. Варта адзначыць, што ў гэтым годзе мы атрымалі фінансаванне двух трохгадовых праектаў і аднагадовага прадпраекта ў межах праграмы Еўрапейскага Супольніцтва «Тэмпус». Мы таксама спадзяемся, што будзе паспяхова развівацца супрацоўніцтва з Каліфарнійскім універсітэтам (г. Фрэсна, ЗША) па праекту стварэння на базе факультэта прыкладной матэматыкі школы бізнеса. Свой вялікі ўклад у моўную падрыхтоўку студэнтаў прынясе і сумесны міжнародны праект кафедры нямецкай мовы БДУ і Рурскага універсітэта, што фінансуецца Нямецкай службай акадэмічных абменаў за кошт бюджэтных сродкаў. Неабходна максімальна прыцягваць замежныя інвестыцыі ў наш універсітэт, а гэта дазволіць захоўваць і пашыраць колькасць рабочых месцаў і дасць магчымасць атрымліваць новыя кнігі, абсталяванне і г. д. Не сакрэт, што многія універсітэты на Захадзе жывуць у значнай ступені за кошт міжнародных праектаў.

Трэба адзначыць, што цікавай і карыснай формай супрацоўніцтва з'яўляецца правядзенне на базе Белдзяржуніверсітэта міжнародных навукова-практычных канферэнцый з прыцягваннем фінансавання з-за мяжы і ўдзелам партнёраў БДУ. Такія мерапрыемствы не толькі не патрабуюць фінансавых выдаткаў з боку БДУ, але і прыносяць вялікую карысць у плане абмену навуковымі ідэямі, усталявання новых кантактаў, публікацый. Пры паспяховым падыходзе яны могуць прыносіць і здабытак універсітэту.

Прынамсі, што тычыцца ўдзелу ў міжнародных канферэнцыях, трэба заўважыць, што нашы супрацоўнікі з вялікім задавальненнем і ў любы момант гатовы ехаць на канферэнцыю за мяжу, але практычна не праяўляюць ніякага інтарэсу да падобных мерапрыемстваў, якія адбываюцца ў Мінску. Зразумела, рэктарат ажыццяўляў і ажыццяўляе фінансавую падтрымку супрацоўнікаў, што выязджаюць за мяжу для навуковай працы, чытання лекцый, удзелу ў канферэнцыях і г. д.

Адзін са спосабаў — гэта пашырэнне навучання замежных студэнтаў на кантрактнай аснове. Як вядома, факультэты маюць права выкарыстоўваць да 50 % валютных сродкаў, атрыманых ад кантрактаў, на набыццё абсталявання. У цяперашні час у БДУ вядуць навучанне 224 замежныя навучэнцы, з якіх 158 студэнтаў, 64 аспіранты. На кантрактнай аснове вядуць навучанне 123 чалавекі. У гэтым годзе прынята на кантрактнай аснове 36 замежных навучэнцаў. Плануецца прыняць на падрыхтоўчы факультэт для замежных грамадзян 70—75 чалавек.

Адной з праблем, што існуюць у сферы міжнародных сувязей і перашкаджаюць павелічэнню колькасці замежных навучэнцаў, з'яўляецца адсутнасць адпаведных узроўню рэкламных матэрыялаў пра Белдзяржуніверсітэт.

*(Працяг у наступным нумары «БУ»).*

# Працягваючы рубрыку «Гэта яшчэ трэба зразумець!»

# Да ўвагі чытачоў — незвычайны падарунак пяцікурснікаў

# філасофска-эканамічнага свайму факультэту

## 17 ноября ФЭФу исполняется 5 (6) лет

## СТЕСНИТЕЛЬНЫЕ ЮНОШИ

1.

Один стеснительный юноша чесал себе голову, чтобы понять, почему ему трудно знакомиться с девушками. До того дочесался, что облысел. Как-то раз подошел к нему приятель и спросил, что его так заботит.

— Лысина, — ответил стеснительный юноша.

2.

Собрались однажды стеснительные юноши и начали обсуждать, есть ли у них душа. После долгих споров вопрос поставили на голосование и большинством голосов постановили, что у всех стеснительных юношей, независимо от возраста и количества вредных привычек, имеется душа. Узнав о том, девушки решили тоже обсудить эту проблему. Перед стеснительными юношами у них даже было одно преимущество: у всех девушек есть общий праздник — 8 Марта.

3.

Один стеснительный юноша мечтал стать мужчиной, но не знал, с чего начать. Наконец он сплёл венок из золотистых веток ивы и водрузил себе на голову, будто нимб. И так уверился в своей мужественности, что даже совершал потом чудеса.

4.

Задумчивый стеснительный юноша все время жаловался на боль в голове, как раз там, где обычно находится мозг.

— Боюсь, у меня слишком много мозга, — сокрушался несчастный. — Если бы его не было, я бы не чувствовал головной боли.

Но другие стеснительные юноши его утешили, сказав, что тоже чувствуют у себя мозг.

## ПОДРАЖАНИЕ СТРОЦЕВУ

«Студент, обреченно
идущий по улице
В направлении
Национальной
Библиотеки,
Напоминает мокрую
курицу
Напрыгавшуюся на
дискотеке.
Декан, напряженно
смотрящий вслед
Студенту, обреченно
идущему по улице,
Видимо, поскольку он
интеллигент,
Не напоминает мокрую
курицу.
Зам. декана, сидящий за
письменным столом
В соседнем от деканата
кабинете,
Собой напоминает обо
всем
Никем не понятом на
свете.
Прохожие, бредущие по
городу
С неопределенными
целями,
Обязаны беречь
природу...»
И подпись под запиской:
«В. И. Ленин».

* * *

Партизаны крушили мосты,
А потом удирали в кусты.
До сих пор отголоском
войны
Удирают туда пацаны.
Мужики! Уничтожим мосты,
Чтоб спасти молодые
кусты.

* * *

Ку-ку, ку-ку, ку-ку.
Кричит в лесу кукушка.
На пихтовом суку
Найду ее избушку.
Как звезды моряку
И как герольду стремя,
Скажи кукушка дураку
Московское точное время.

* * *

В моей квартире
(советской)
Зря лампочка не горит:
Я берегу электричество,
То бишь, киловат-часы.
В моей квартире
(советской)
Нет ничего зазря:
Есть даже замок
механический...
Но главное — это — я!!!

* * *

Встретил я тебя в универсаме,
Пирожок давила ты рукою.
Шевельнув восторженно
усами,
Я в повидло стал своей
ногою.
Ты смутилась, облизнула
пальцы.
Я галантно стал в повидло
снова.
Закружившись в полусладком
танце,
Поняла меня ты с полуслова.
Если бы все женщины на
свете
Собирались вместе в
магазине,
БЕЛОРУСЫ Б В МИРОВОМ
БАЛЕТЕ
ВЕЧНО БЫЛИ БЫ
НЕОТРАЗИМЫ!

* * *

Я славлю Родину свою,
Свою я Родину ругаю,
Свою так Родину люблю,
Что и врагу не пожелаю.

* * *

Неизвестны, в принципе,
причины,
Почему хирургам не до
шуток,
Что путь к сердцу
каждого мужчины
Пролегает через весь
желудок.

* * *

*— Тук-тук!.. — Кто там?..*
***Шарль Перро***

Безмятежна женщина в
постели,
Свисла на лицо седая
прядь.
О, старушка! Ты закрыла ль
двери,
Перед тем как лечь в свою
кровать?!
Натянула на нос одеяло,
Сдвинула кокошник на висок.
Бдительность неужто
потеряла,
Поутру заштопав свой носок?!
К дому твоему бежит
волчище:
...Серый, злой, голодный
зверь...
Вслед за ним по лесу
ветер свищет...
Встань, старушка!
Забаррикадируй дверь!!!
Да прислушайся к лесным
Сопливобулькающим
звукам, —
Там... твоя внучка под
сосной ревет.
Серый волк коварным
волчьим трюком
Выведал — твой! — адрес
у нее.
Сбрось с себя скорее одеяло,
И вооружись хотя бы
топором...
Впрочем, этого, конечно,
мало,
Чтобы справиться с таким
врагом.
Мину закрепи в проеме двери;
И ложись спокойно дальше
спать.
Больше никогда лесные звери
Твой покой
не будут
дерзко
нарушать!..




## ЗАБЕГАЯ НАПЕРЁД,

можно с уверенностью сказать, что День Студента на ФЭФе в этом году удался на славу!.. Уже бросается в глаза тот факт, что ранним утром, как говорится, после дождичка в четверг, нескончаемые толпы юных любителей философии и прочих премудростей направились в ВПШ, чтобы исполнить свой великий долг. Они шли и шли, шли и шли!.. И казалось, нет такой силы, которая бы смогла остановить их. Но сила эта была. Дверь.

Робкий вопль возмущения пронесся над толпой («Ура! Каникулы!!!») и вскоре он перерос в бурю («Как прекрасен этот мир, посмотри; как прекра-а-а-а-асен этот ми-и-ир!»).

По неизвестно кем и когда установленной традиции за этим всем свысока следило Всевидящее Око Деканата, оно же — Всеслышащее Ухо и Всепронюхивающий Нос. И делало далеко идущие выводы, так как они напрашивались сами.

Первым напросился такой: «За что?» Вторым: «Чаму?»

Тем временем на улице вовсю продолжался праздник. Все вместе и каждый по отдельности толкали входную дверь ВПШ. Никакого обмана не было: закрыто!... И надо же так случиться... Кто бы мог предположить... Нашелся тут один... Нет, чтобы толкнуть... А он возьми — и — потяни... И все испортил.

Со страшным скрипом открылась дверь. Но скрипела — не она. Это скрипели мы. Стало понятно, что занятий не избежать. Бежать прочь — тоже было глупо. Вошли. Вышли. Вошли. Вышли. Вошли. Весело. Значит, еще не все потеряно.

* * *

Весь первый этаж занимал Вахтёр, точнее, его улыбка. Мы тоже улыбнулись. Поздоровались. Обнялись. Чувствуем, что немного переборщили во взаимных любезностях, но — ихним нравится. Ну и ладно.

Идем наверх. Глядь, а на дверях деканата табличка висит «Бюро добрых услуг». Непонятно. Заходим. А там Анкл Бенс сидит и не порусски говорит. Всех перепугал. Мы — бежать!..

Я — направо, а остальные — за мной. Вижу — дверь приоткрыта, а на ней надпись: «Комната страха» и подпись: «Намеснік дэкана». Думаю, что это просто шутка. Заглянул за дверь. Нет, правда.

Прибегаю на пару. Только отдышался, как слышу шаги: топ-топ-топ. Наверное, померещилось. Вдруг опять: топ-топ-топ. Экая навязчивая галлюцинация.

— Топ-топ-топ!..
— Кто там?
— Топ-топ-топ.
— Заходи.
— Топ-топ-топ-топ-топ...
Утопало наконец-то.

**Федор ПЕКАРСКИЙ**
**ФЫ.**

## КРАТКАЯ АНКЕТА ДЛЯ ВЫЯВЛЕНИЯ ЭДИПОВА КОМПЛЕКСА В СЛАБОВЫРАЖЕННОЙ ФОРМЕ У СТУДЕНТОВ И АСПИРАНТОВ:

**1. Нравятся ли вам женщины-экзаменаторши?**

**а) Если «да» — вы мужчина;**

**б) Если «нет» — вы женщина.**

**2. Хотелось ли вам когда-нибудь быть похожим на вашего декана или зам. декана?**

**а) Если на декана — запишите себе «пятёрку» по социологии;**

**б) Если на зам. декана — «пятерку» по философии,**

**3. Хотелось ли вам когда-нибудь убить своего шефа и жениться на его супруге?**

**а) Если «да» — вы маньяк;**

**б) Если «нет», то почему бы и нет.**

**4. Можете ли вы пройти мимо, боком, наскоком, напрыгом, марш-броском?**

**а) Вы — Эдип;**

**б) Вы — Комплекс;**

**в) Это вас не касается.**

## ИЗ НАДПИСЕЙ НА ПАРТАХ ВПШ:

На партах писать строго запрещается.
Администрация.

Хорошо, не будем!..

## НА ЭТИ ВОПРОСЫ МОЖЕТ ОТВЕТИТЬ КАЖДЫЙ (если захочет, конечно)

1. С кем бы вы пошли в разведку? Почему именно в разведку?

2. Даёте ли вы детям спички; стоите ли под стрелой; влезаете ли туда, где «убьёт»?.. Вообще, как вы проводите свой досуг?

3. Если к вам на улице подойдет незнакомый человек, дружески похлопает вас по плечу, снимет ваши очки и доверительно посмотрит в глаза... Какой вопрос вы будете от него ожидать?

4. Продолжите числовой ряд: 1, 2, 3, 4, 5...

5. Что вы легче всего запоминаете: имена, телефоны, холодильники, телевизоры, стиральные машины или хорошие шутки?

**Федор ПЕКАРСКИЙ.**

**И ГРУППА ТВОРЧЕСКОГО ПЛАГИАТА ИМ. З. ФРЕЙДА**



# Ярбяон 71 ястеянлопси уФЭФ тел (6) 5

## Из ранних произведений Виталия Корбута

### ЧААДАЕВ И ДРУГИЕ

Шеллинг считал Чаадаева самым умным человеком мира и очень его любил. И как только встречал какого-нибудь русского, сразу просил кланяться Чаадаеву. И передавал ему воздушные поцелуи в конверте. Откроет Петр Яковлевич конверт, а оттуда ему шеллинговский поцелуй. Совсем Шеллинг Чаадаева зацеловал, так что тот даже конверты перестал вскрывать и пересылал их знакомым дамам, которые были от этого в восторге.

Пушкин также находился под впечатлением от личности Чаадаева. Поедет он, бывало, в светский салон, где Петр Яковлевич блистает, наберется от него мудрости и едет какого-нибудь «Евгения Онегина» писать.

Грибоедов, тот вообще был без ума от Чаадаева. Он Чаадаеву даже место главного героя выделил в своем «Горе от ума». Только назвал его почему-то Чацким. Загадка какая-то.

Всем известно, что Чаадаев был украшением светских салонов, потому что обладал глубоким саркастическим умом и великолепным профилем. Приезжает он в салон обычно и ходит, повернувшись ко всем профилем, и при помощи своего саркастического ума выдает различные исторические фразы.

### ЭЙНШТЕЙН И МАЛЬЧИК

Однажды Альберт Эйнштейн перед обедом гулял по берегу озера и размышлял о судьбах человечества. Глобальные проблемы бороздили просторы его мозга и проявлялись на лбу в виде морщин. Вдруг детский крик достиг уха великого ученого. С трудом оторвавшись от общемировых проблем, Эйнштейн перевел взгляд с заоблачных высот на гладкую поверхность озера. На поверхности расходились круги, создаваемые тонущим мальчиком. Голова его периодически скрывалась под водой, но руки продолжали бороться за жизнь всего организма.

Сомнения одолели создателя теории относительности: может ли он, ученый с мировым именем, рисковать своей жизнью из-за какого-то мелкого мальчишки, не научившегося плавать? А вдруг он погибнет и осиротевше человечество будет плакать на его могиле и проклинать негодного ребенка? Может ли, имеет ли право он, Альберт Эйнштейн, бросить человечество на произвол судьбы, лишить себя и своих выдающихся открытий? Пока он так размышлял, руки мальчика тоже уже стали скрываться под водой. И отбросив все сомнения, Альберт Эйнштейн кинулся с разбегу в озеро, рискуя своей выдающейся жизнью, — и спас мальчика. За что честь ему и хвала.

* * *

Кант очень любил на кухне у себя сидеть. Бывало, кухарка ему суп какой-нибудь готовит, а он сидит себе и смотрит. Даже хотел было книжку написать «Критика кулинарного искусства». Уже начал предисловие писать. Кухарка перед ним ложку положит, тарелку поставит, суп нальёт... А он возьми да и напиши, что, мол, нужно исследовать инструмент познания, прежде чем пустить его в дело. И тут же на практике воплощает. Начинает ложку измерять, взвешивать... Так ее и исследует, пока суп не остынет. Гегелю это, конечно, не нравилось. Он вообще не любил, когда продукты переводят. Видно, тяжелое детство было у него. Вот тогда Гегель и произнес историческую фразу, мол: «Кант хочет научиться плавать, не залезая в воду». То ли он пошутил, то ли пытался Канта раскритиковать. Но по всему видно, что переборщил.




### РИСУНКИ ОПРИЧЯ КРОМЕШНЕГО

Осень. Ветер рвет листья на деревьях и становится сильнее час от часу. Вот сегодня днём до того окреп, что сдул с тротуара одну старушку. Она летела над землёй, размахивая руками и ногами и зажатыми в руках авоськой и зонтиком.

Пролетая мимо меня, она что-то весело крикнула и подфутболила кого-то невидимого ногой, а затем скрылась за поворотом.

Я шел, а этот случай все не выходил у меня из головы. Что-то было не так! Что-то не совпадало с законами природы!.. И только недавно я понял, что летела-то старушка против ветра.

Где она сейчас?

* * *

А что если разогнаться и головой в стену?! Я тут недавно пробовал, — не получается. То мимо пробегу, то не добегу. Странно.

* * *

Один довольно симпатичный маленький мальчик в свободное от учебы время мыл машины — и зарабатывал кучу денег. За эти деньги он покупал жвачки, сигареты и приставал по вечерам ко взрослым девушкам.

Спасибо товарищу Горбачеву за его счастливое детство!

* * *

Таракан бежит по стене. Лихо бежит, как орловский рысак. К нему бы возок приделать — и перевозил бы себе полезные грузы. Ну, а пока он просто бежит по своим тараканьим делам. Скорее всего в поисках пищи. Интересно, где на стенке пища?!. Но ему, таракану, видней. Бежит себе и не думает, небось, что за ним венец творенья наблюдает. А ну, как я его тапком прихлопну? Беру тапок и хлопаю: хлоп! Добегался, идиот.

Наверное, я Бог для таракана. Вообще-то каждый человек — слегка Бог для таракана и других мелких насекомых. Ходят кругом тараканьи Боги, бегают в поисках пищи, а потом их — тапком: — хлоп! Мокрое место.

Добегался, идиот. Нету на стене пищи. Нету!!!

* * *

Один дяденька носил фамилию Штраус. С самого детства он от этого страдал. Дети дразнят, соседи дразнят: «Страус! Страус! Глупая ты птица!» А потом дяденька вырос и над ним не только во дворе стали смеяться. Бывало, как назовут его фамилию, так вся Вена со смеху покатывается. Дальше — больше. Весь земной шар. Вот она — слава!

### ШУТКИ С ЭЛЕКТРИЧЕСТВОМ

Одного электрослесаря ударило током, когда он люстру менял. Он со стула упал и лежит — скучает. И ничего не может. Так и говорит: «Ничего не могу». Вызвали врачей, они его послушали, постучали и говорят: «Да! Он ничего не может». И забрали в больницу. Лежит он в больнице, ничего не может. Ему разные уколы делают, инъекции и ингаляции... А он упорно ничего не может. Врачи стали в тупик. И тут одна нерадивая медсестра на него настольную лампу уронила. Электрослесаря опять током шарахнуло. Тут он вскочил и говорит: «Я могу!» Врачи его обследовали и говорят: «И вправду, может». И выписали из больницы.

Так он до сих пор где-то живет и может. А на вопросы: «Как живёшь? Как можешь?» — он скромно отвечает: «Да, могу».

Опасны шутки с этим электричеством.

* * *

Когда Энгельс решил написать работу, умер Бруно Бауэр. Вот смеху-то было. И так всегда. Только Энгельс собирается какую-нибудь работу написать, и тут же кто-то умирает. Так и Карла Маркса погубил, окаянный. Видно, из зависти.

* * *

**Однажды маленький гражданин Петров и большой гражданин Сидоров совершенно случайно встретились на улице. И прошли мимо друг друга, потому что они шли по делам. И если бы они шли не по делам, а наоборот — просто гуляли, то Петров мог бы воскликнуть: «Ха! Да это ж Сидоров!» А Сидоров мог бы важно сказать: «Здравствуй, Петров!..» И они пошли бы и выпили бы где-нибудь по бокальчику пива. Но ничего этого не случилось. Дела!**




*Рисунок Фёдора ПЕКАРСКОГО ФЫ.*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

4 лістапада
Зак. 1778.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 411—412
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара Т. М. КАЗАК

Газета падпісана ў друк у 16.00.